# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## 9 клас
## Варыянт 2

**Заданне 1.** Вядома, парадак павінен быць не толькі ў наваколлі, але і ў паводзінах, адносінах да жыцця. Маральным арыенцірам для людзей могуць лічыцца аўтары беларускай літаратуры, крылатыя словы якіх падказваюць нам напрамак жыцця. Прачытайце выказванні беларускіх мастакоў слова і выканайце фанетычнае заданне: пастаўце знак “+” у патрэбным слупку табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Як цывілізацыя нішчыць прыроду, так хамы нішчаць грамадства.* (У. Рубанаў)

| № п.п. | Пытанні | Так | Не |
|---|---|---|---|
| 1 | Транскрыпцыя слова *грамадства* [грама́тства] правільная? | | |
| 2 | У слове *нішчыць* вымаўляецца падоўжаны гук? | | |
| 3 | У слове *цывілізацыя* колькасць гукаў і літар супадае? | | |
| 4 | У фразе 3 фанетычныя словы? | | |
| 5 | У спалучэнні слоў *так хамы* адзін гук санорны, тры гукі – шумныя глухія? | | |
| 6 | У фразе вымаўляецца 8 мяккіх гукаў? | | |

**Заданне 2.** У гарадах і вёсках існуюць аб’екты, якія забяспечваюць іх жыццядзейнасць. Гэтыя аб’екты складаюць гарадскую або вясковую ***інфраструктуру***. Пастарайцеся правільна вызначыць лексічнае значэнне кожнага з інфраструктурных найменняў і спалучыце словы з левага слупка з іх значэннямі ў правым слупку. Адказ запішыце ў наступнай форме: А1Б2В3Г4Д6Е7 (звярніце ўвагу, што адна з назваў лішняя).

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | Значэнне слова |
|---|---|
| А | Установа для стацыянарнага лячэння хворых |
| Б | Установа, якая збірае і захоўвае кнігі і іншыя друкаваныя і рукапісныя творы, прапагандуе і выдае кнігі чытачам |
| В | Прадпрыемства, памяшканне для гандлю чым-н. |
| Г | Установа, якая збірае, вывучае, зберагае і выстаўляе для агляду помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры, а таксама прыродазнаўчыя калекцыі |
| Д | Месца прыпынку цягнікоў і іншых транспартных сродкаў, якія курсіруюць па пэўным маршруце |
| Е | Прадпрыемства, якое аказвае паслугі па ачышчэнні адзення, тэкстыльных вырабаў |

| | Аб’ект інфраструктуры |
|---|---|
| 1 | бібліятэка |
| 2 | станцыя |
| 3 | паліклініка |
| 4 | бальніца |
| 5 | музей |
| 6 | хімчыстка |
| 7 | крама |

| А | | Б | | В | | Г | | Д | | Е | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|

**Заданне 3.** Зладзьце добраўпарадкаванне паркавай тэрыторыі па-беларуску, пераклаўшы з рускай мовы назвы неабходных для гэтай справы інструментаў, матэрыялаў і іншыя словы з названай галіны дзейнасці.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | | | |
|---|---|---|---|
| *семена* | | *дёрн* | |
| *совок* | | *цветник* | |
| *садовые ножницы* | | *фонарь* | |
| *саженец* | | *беседка* | |
| *удобрения* | | *тропа* | |
| *пруд* | | *усадебный парк* | |

**Заданне 4.** Бадай што самы прыемны вынік добраўпарадкавання тэрыторыі – яе азеляненне. Але высаджванне дрэўцаў не такая простая справа, бо для кожнага з іх, у залежнасці ад пароды, трэба падабраць найбольш спрыяльнае для росту месца. Важна таксама ўлічваць і як розныя віды дрэў могуць ужывацца адно каля другога, і эстэтыку іх агульнай кампазіцыі на адпаведнай тэрыторыі.

Ацаніце прапанаваную вам "тэрыторыю" (табліцу), улічваючы, якая граматычная форма дзеяслова прымеркавана да кожнага слупка. З улікам гэтага падбярыце шэсць патрэбных "дрэўцаў" (граматычных формаў), каб "пасадзіць" іх у пазначаных месцах.

**Узор:**

| | | | |
|---|---|---|---|
| |  ***еду*** | | *едзьце* |
| *рабіць* | |  ***робіце*** | |

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | | | |
|---|---|---|---|
| | |  | *пачніце* |
| *размалоць* |  | | |
| *вырыць* | | |  |
| | *вазьму* |  | |
| | *адаб'ю* | |  |
|  | | *даследуеце* | |

**Заданне 5.** Добраўпарадкаванне – гэта імкненне не толькі да парадку, але і да міру, ладу, утульнасці, да сувязі пакаленняў і пераемнасці традыцый. Прачытайце ўрывак з нарыса У. Караткевіча "Зямля пад белымі крыламі". Запоўніце табліцу, упісаўшы ў правы слупок словы (словазлучэнне) у адпаведнай граматычнай форме згодна з пазначанымі ў левым слупку іх характарыстыкамі.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*За выключэннем некаторых раёнаў Палесся, беларускую хату ніколі не беляць знадворку, толькі ўнутры.*

*У нас хату часта будуюць талакою, з тоўстага і смалістага сасновага бярвення. Падлога таксама* ***з дошак****. І столь, вядома, таксама дошкавая, зверху, на гары, на яе насыпаецца пілавінне, для цеплыні. Стрэхі раней былі саламяныя або з чароту, які даўжэй служыць, бо, калі страху растрэплюць вятры і дажджы, чарот можна зняць і зноў перакрыць ім хату. І так два ці тры разы. Цяпер гонтавы дах бывае на хаце часцей за ўсё. За ім ідзе шыфер. Чарапіца сустракаецца досыць рэдка.*

*Хату заўсёды будуюць вокнамі на вуліцу. Уваход калісь быў адзін, у пераважнай большасці выпадкаў, з двара, а цяпер усё часцей з вуліцы.*

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Член сказа, якім з’яўляецца выдзеленая прыназоўнікава-іменная канструкцыя | |
| 2 | Назоўнік I скланення, у якім у давальным і месным склонах адзіночнага ліку пішацца канчатак -Э | |
| 3 | Састаўны прыназоўнік | |
| 4 | Прыслоўе, утворанае прыставачна-бяссуфіксным спосабам | |
| 5 | Дзеяслоў, які мае наступную структуру: прыстаўка, корань, суфікс | |
| 6 | Лічэбнік, які змяняецца па родах, ліках і склонах | |

**Заданне 6.** Добраўпарадкаванне горада, несумненна, пачынаецца з ачышчэння. У сувязі з гэтым мы прапануем вам “ачысціць” ад памылак паведамленні, размешчаныя на рэкламных шчытах. Дапамажыце выявіць, патлумачыць і паправіць дапушчаныя памылкі. Улічыце, што сярод прапанаваных могуць быць як сказы з памылкамі, так і правільныя сказы. Калі памылак няма, то напішыце “Няма памылак”.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| № сказа | Сказ |
|---|---|
| 1 | Пакіньце заяўку зараз! Мы звяжамся з вамі ў бліжэйшы час! |
| 2 | Кожнае дзіцяці мае права жыць і выхоўвацца ў сям’і. |
| 3 | Набывайце толькі ў нас! Вам не давядзецца траціць большую палову заробку, каб набыць мікрахвалевую печ. |
| 4 | Сусветны фестываль моладзі збірае маладых юнакоў і дзяўчат Магілёўшчыны. |
| 5 | Дакументы для рэгістрацыі можна падаваць не толькі асабіста, але і перасылаць па пошце. |
| 6 | Наведвальнікі кафэ могуць пакаштаваць самыя разнастайныя рыбныя далікатэсы. |

| № сказа | Тлумачэнне памылкі (пры яе наяўнасці) | Выпраўлены варыянт сказа |
|---|---|---|
| 1 | | |
| 2 | | |
| 3 | | |
| 4 | | |
| 5 | | |
| 6 | | |

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Озеленение территорий, согласно техническому кодексу по вопросам озеленения, производится на основании разработанной проектной документации и проекта производства работ с учетом технологических требований и включает ряд последовательных процессов: подготовку территории к озеленению, посадку деревьев и кустарников, создание газонов, цветников, уход за зелеными насаждениями в течение двух лет. *(По материалам интернет-ресурсов.)*

______________________________________________________________

______________________________________________________________

*Уявіце, што Вы трапілі ў Стары Горад, у якім усё так або інакш звязана з літаратурай. Пастарайцеся зразумець яго жыццё. Для гэтага спатрэбяцца веды з тэорыі, гісторыі літаратуры і ўласная творчая фантазія.*

**Заданне 8.** Вы трапляеце на плошчу Тэорыі, дзе на цэнтральнай стэле размешчаны ўрывак з верша Пімена Панчанкі “Горад”. Каб прайсці далей, трэба прааналізаваць гэты ўрывак і адказаць на некалькі пытанняў (звяртайце ўвагу на вылучанае слова / вылучаныя словы ў пытаннях).

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Кожны дом характар мае,
Таямніцы – кожны двор.
Той – балкон свой выстаўляе,
Нібы сківіцу баксёр.

Той – будынак-расплывуха,
Дзе там вокны, дзе ўваход?
Той глядзіць нахабным зухам
На архітэктурны зброд.

Той слановыя калоны
У зямлю навечна ўбіў...
Недагледжаныя клёны
Лістапад абцерабіў.

1976

| Пытанне | Адказ |
|---|---|
| Якую *рыфмоўку* выкарыстаў паэт у першай страфе? | |
| Які вершаваны *памер* у другой страфе? *Памятайце, што вершаваны памер – гэта не толькі назва стоп, але і іх колькасць (напрыклад, 5-стопны ямб)* | |
| Які *троп* у наступных радках: “Недагледжаныя *клёны* / *Лістапад абцерабіў*”? | |
| Ці праўда, што ў другой страфе выкарыстана *анафара*? Калі так, то дакажыце гэта. | |
| Якія *эпітэты* выкарыстаў паэт у другой страфе? | |
| У вершы нехта калоны “ў зямлю *навечна* ўбіў”. Які мастацкі прыём (троп) тут выкарыстаны? | |

**Заданне 9.** Ад плошчы Тэорыі разыходзяцца тры вуліцы, названыя імёнамі беларускіх пісьменнікаў. Падпішыце партрэты пісьменнікаў і размясціце пералічаныя гарадскія аб’екты, адзначыўшы нумар кожнага аб’екта ў ячэйцы на адпаведнай вуліцы (улічыце, што ячэек больш, чым аб’ектаў).

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

**Гарадскія аб’екты:**

1. Скульптурная інсталяцыя “Паром на бурнай рацэ”
2. Сувенірная крама “Срэбразвонны ручэй”
3. Студыя прыгажосці “Явар і каліна”
4. Гандлёвы цэнтр “Пад белымі крыламі”
5. Прытулак для жывёл “Лебядзіны скіт”
6. Тэатральная студыя “Паўлінка”
7. Кафэ “Жывая вада”
8. Цэнтр дзіцячай творчасці “Сымон-музыка”
9. Помнік князю Вячку




**Заданне 10.** У Старым Горадзе ёсць парк, названы імем беларускага пісьменніка, чыё 135-годдзе будзе адзначацца ў снежні гэтага года. Пры жыцці выйшаў толькі адзін зборнік гэтага паэта, але яго ўклад у развіццё беларускай культуры цяжка пераацаніць. На жаль, ён пайшоў з жыцця зусім маладым, калі яму не было яшчэ 26 гадоў. Гэта быў паэт “чыстай красы”, які ўславіў у паэзіі беларускую прыроду, гісторыю і культуру.

**Здагадаліся? Напішыце, хто гэта,** на таблічцы каля ўвахода.

У парку адбываецца літаратурнае свята. Дапамажыце рэжысёру прыдумаць два розныя мерапрыемствы, звязаныя з творамі гэтага пісьменніка, якія Вы вывучалі на ўроках беларускай літаратуры. **Назавіце гэтыя творы і апішыце фармат кожнага мерапрыемства**: што будуць рабіць госці і жыхары горада, як гэтае мерапрыемства звязана са згаданым творам. Каб свята было цікавым, мерапрыемствы не павінны быць аднатыпнымі.

Для афармлення святочнай пляцоўкі **ўспомніце дзве цытаты** з твораў пісьменніка, імем якога названы парк, і **запішыце іх на стэндах з адзначэннем назвы твора**.

***Узор выканання задання:***

*Калі б парк насіў імя Змітрака Бядулі, то адно з мерапрыемстваў было б па адным з яго апавяданняў.*

| | |
|---|---|
| *Твор* | *Апавяданне “На Каляды к сыну”* |
| *Фармат* | *Дыскусійны клуб (дэбаты). Удзельнікі дзеляцца на каманды (абаронцы сына, абвінаваўцы сына). Асноўныя пытанні: “Чаму здарылася трагедыя? Хто вінаваты – сын, які адрокся ад сваіх каранёў, ці грамадства, якое страціла традыцыйную сістэму маральных каштоўнасцей?”* |
| *Сувязь мерапрыемства з творам* | *Такі фармат дапаможа глыбей зразумець твор Змітрака Бядулі і праблемы сучаснасці* |

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*




## Мерапрыемства 1

| | |
|---|---|
| *Твор* | |
| *Фармат* | |
| *Сувязь мерапрыемства з творам* | |

## Мерапрыемства 2

| | |
|---|---|
| *Твор* | |
| *Фармат* | |
| *Сувязь мерапрыемства з творам* | |

## Цытаты



